Год II. Пятніца, 1-га красавіка (апрэля) 1921 г. № 13.

НАША ДУМКА

Палітычная, экономічная і літэратурная тыднёвая газэта

ПАДПІСКА: на 3 месяцы 100 марак або 5 ф. мукі. Цана асоб. нумэру 6 марак. Адрэс: Вільня, Вострабрамская 5 (Пасаж).

Беларуска-літоўскія адносіны за 3 гады.

Пад час, калі на тэрыторыі „заакопнай“ Беларусі рэвалюцыйны беларускі рух концэнтраваўся ў Менску, перадкопная Беларусь мела свой цэнтр—Вільню.

25-27 студзеня 1918 г. ў Вільні адбылася конфэрэнцыя прадстаўнікоў беларускага насяленьня старой нямецкай акупацыі, на якой была выбрана „Віленская Беларуская Рада“. Пасьля разгону маскоўцамі-бальшавікамі ўсебеларускага зьезду ў Менску (18 сьн. 1917 г.) віленскія беларусы, разважыўшы утварыўшуюся палітычную сітуацыю, пагражаючую беларускай справе, як з маскоўскага, так і польскага боку, лічылі патрэбным знайсьці формулу згоды з ліцьвінамі.

Як ведама, у склад Літоўскай дзяржавы, якая ў той час пачала фармавацца, увайшлі і некаторыя беларускія землі, як напр. большая частка Гродзеншчыны і значная частка Віленшчыны. Для беларусаў, пагражаемых з усіх бакоў, такі вынік справы ў той час быў найбольш пажаданым, і супольнае жыцьцё з ліцьвінамі зьяўлялася ў даным прыпадку не здарэньнем, а адраджэньнем многавечнага супрацоўніцтва на карысьць абодвух народаў.

У свой чарод і ліцьвіны не маглі не адчуваць патрэбы згоды з беларусамі, бо этнографічная Літва ня мела супольнай граніцы з Польшчай і была аддзелена ад Польшчы поясам беларускага насяленьня.

У рэзультаце перагавораў паміж Літоўскай Тарыбай і Віленскай Беларускай Радай, было пастаноўлена, што: 1) шэсьць сяброў Віленскай Беларускай Рады уваходзяць у склад Літоўскай Дзяржаўнай Рады (Тарыбы), 2) утвараецца партфэль міністра беларускіх спраў пры Літоўскім Урадзе.

З мамэнту гэтай згоды (сьнежань 1918 г.) пачынаецца сумесная беларуска-літоўская праца па абароне беларуска-літоўскіх тэрыторый Літвы ад захватніцкіх намярэньняў суседзяў: Расеі і Польшчы. У беларускіх паветах Літвы заводзіцца беларуская адміністрацыя, у Горадні пачынае фармавацца беларускае войска, там-жа скора адбываецца зьезд прадстаўнікоў Горадзеншчыны, які вынес паміж іншым пастанову аб далучэньні Горадзенскай часьці Беларусі да Літвы дзеля абароны ад польскіх захватаў. Аднак, супольных беларускіх і літоўскіх высілкаў нэ хапіла, каб абараніцца ад дужэйшых суседзяў, і скора мы становімся сьведкамі захватаў беларуска-літоўскай фэдэрацыі то бальшавікамі, то палякамі, ў рэзультаце чаго амаль ні ўся Віленшчына і Горадзеншчына адбіраецца ад Літвы і пераходзіць з рук у рукі да бальшавікоў ці да палякоў.

Беларуска-літоўскія адносіны за гэты час не заўсёды астаюцца роўнымі, і быў адзін такі мамэнт, калі зусім папсаваліся. Было гэта пад час, калі бальшавікі пакінулі Вільню, а ўвайшлі ліцьвіны. Дзякуючы няўмельству новага міністра беларускіх спраў п. Сямашкі, дзякуючы таму, што п. Сямашка стаў весьці ні чым з нашага боку ня выкліканую барацьбу з намі, а таксама дзякуючы таму, што і Літоўскі Урад, як па усім было відаць, павёў у адносінах да нас палітыку ala Сямашка, адносіны нашы папсаваліся.

Гэтая дзіўная палітыка, нашкодзіўшая потым і ліцьвіном, бо адкінула многіх з іх беларускіх прыхільнікаў у варожы ліцьвіном бок, скора, однак, была зьменена на другую,

Паміж Беларускім Урадам Ластоўскага і Літоўскім Урадам пачаліся перагаворы, у рэзультаце якіх дасягнута была поўная згода. Літва і Беларусь узаемна прызналі адна адну і заключылі абаронны саюз.

Гэтая ўмова, каторую ў сучасны мамэнт немагчыма зрэалізаваць, мае надзвычайна вялікае значаньне для будучыні. Што-б „цяпер“ мы ні бачылі навокала сябе, мы можам быць пэўнымі, што „заўтра“ прынясе нам зьмены і ў аснову гэтых зьмен будзе паложана беларуска-літоўская згода, беларуска-літоўскі саюз, моцны, трывалы, дабравольны.

Няхай жывуць незалежнымі Літва і Беларусь!

Няхай узмацоўваецца Саюз Літоўскага і Беларускага Народаў!

Віляйчук.

Па „старарэжымнаму“ рэцэпту!

Праз Вільню праяжджаў польскі міністар Домбскі.

Ен варочаўся з Рыгі ў Варшаву, «ўдачна» закончыўшы міравыя перагаворы з Савецкай Расеяй.

«Удачна» скончыліся рыжскія перагаворы для Польшчы, але вельмі сумна для народу беларускага, дый, агульне кажучы, для ўсяго Беларуска-Літоўскага краю: з жывога цела Беларусі палякі і бальшавікі выразалі добры кусок—бязмала ўсеньку Горадзеншчыну, кусок Меншчыны, Вялейскі і Дзісненскі паветы Віленшчыны, і гэты кусок прылучаны да Польшчы; а шырокім Вялейска-Дзісненскім калідорам Вільня аддзелена ад усякае лучнасьці з Усходняй Беларусьсю.

Дык і цешыліся палякі з Рыжскага міру, і віталі свайго міністра, каторы, як некалі нямецкі генарал Гофман у Брэсьці, патрапіў урваць добрую частку зямлі Беларускае. Гэтаж так зразумела: няхай наш край рэжуць на кускі, няхай з яго робяць „Kresy Wschodnie“, як некалі маскалі рабілі „Сѣверо-Западный Край“, — абы толькі Польшча мела карысьць! Так думаюць, так адкрыта кажуць рэакцыйныя тутэйшыя палякі — «грамадзяне» нашае зямлі...

Але такімі думкамі і паглядамі яны нікога ня зьдзівяць: і мы тут ведаем, і ўсюдах заграніцай аб іх ужо вядома! Тутэйшым гэтым палякам ідзець аб нешта другое: яны хочуць паказаць усяму сьвету, што ня толькі палякі, а і ўсе тутэйшыя жыхары глядзяць гэтак сама!

Дзеля гэтага мелася ехаць у Парыж ад імя ўсяго места Вільні дэлегацыя, выбраная эндэцкай часткай мястовых радных супроць галасоў соцыялістаў і дэмакратаў, бяз учасьця радных другіх нацыянальнасьцей. Дэлегацыя мелася заявіць у Парыжу, што ўсе жыхары Вільні просяць прылучыць чым хутчэй места нашае да Польшчы. І хоць мястовая рада ня мае чым плаціць пэнсіі работнікам, хоць з гэтае прычыны нам прыходзіцца сядзець упоцемку, бо работнікі электрычнае станцыі бастуюць,—на падарожу дэлегацыі грошы хватае! Хватае, хоць на яе трэбала выдаць ня менш мільёну польскіх марак (прыблізна па 5.000 франкаў на тры асобы, што па курсу дня роўна каля мільёну польск. мар.).

Праўда, дэлегацыя далей Варшавы не даехала, і мільён марак горад зьбярог. Дык-жа з прычыны праезду праз Вільню міністра Домбскага палякі зрабілі другую маніфэстацыю. На віленскім вагзале польскага міністра сустрэла дэлегацыя працаўнікоў чыгункі і прасіла яго прылучыць да Польшчы Вільню—так, як ён прылучыў заходнія часткі Беларусі. І паляцелі на ўвесь сьвет тэлеграмы аб гэтым «выяўленьні волі» тутэйшых работнікаў належаць да Польшчы...

Яно-б здавалася, што ўсё добра, ўсе ў парадку. Тутэйшы народ хоча да Польшчы, і ўсё! Але прыглядзьмася, якія гэта «тутэйшыя» віленскія чыгуншчыкі.

Можна сьмела сказаць, што запраўды тутэйшых людзей між віленскімі чыгуншчыкамі асталася зусім малая жменька. Справа ў тым, што ў мамэнт бальшавіцкага наступленьня польская ўлада загадала ўсім чыгуншчыкам выбірацца ў Польшчу. І многа іх выехала на Заход, але мала вярнулася назад: польская ўлада парупілася даць ім работу ў Польшчы, а на іх месца паслала ў Вільню цэлую хмару «сваіх» — палякоў ня тутэйшых, а польскіх. А тым запраўды тутэйшым людзём, якія навет перад пагрозай бальшавіцкага тэрору, ахвярай каторага паў грам. Качаноўскі (пачт.-тэл. служачы) і другія, не хацелі раставацца з бацькаўшчынай, — тым на чыгунцы ў Вільні месца ўжо не знайшлося: ім заявілі, што яны—„бальшавікі“, і запрапанавалі таксама ехаць на службу ў Польшчу, бо тут іх месцы заняты прывознымі палякамі...

Вось, значыцца, праўда аб віленскіх чыгуншчыках. Яны зусім чужыя нашаму краю людзі, і іх выступленьне—гэта сьвядомае фальшаваньне волі тутэйшага насяленьня!

Пры гэтай прыгодзе гожа прыпомніць, што «дэмакратычная» Польшча вядзе такую-ж палітыку ў адносінах да жыхараў «Kresów», якую вяла самадзяржаўная Расея ў адносінах да насяленьня «акраін». Некалі—пад Расеяй — нашы «тутэйшыя» ніяк не маглі дастаць работы ў сябе дома: іх прынімалі на казённую службу адно толькі ў вялікарускіх губэрнях, затое да нас слалі вялікарусаў. І тыя навезеныя чыноўнікі рабілі ў нас «патрыятычныя маніфэстацыі», «паднасілі» іконы і адрасы «цару-бацюшцы» і вялікім „чынам“, даведываўшымся да Вільні,—і ўсё ад імя „тутэйшага насяленьня“...

Акурат таксама, як навезеная польская адміністрацыя чыгункі арганізавала прывітаньне польскага міністра і ад імя „тутэйшага насяленьня“ прасіла аб далучэньне да Польшчы!

Г. Б.

Беларусы у Амэрыцы.

(Пісьмо з Нью-Іорку)

Сярод славянскіх народаў значны лік эмігрантаў ў Амэрыку—далі беларусы.

Налічваецца тамака нашых братоў да мільёну.

Усё гэта, найбольш, сяляне з безьзямельных-вёсак.

Частка з іх прыехала ў Амэрыку назаўсёды. Гэтыя пастараліся абзавесьціся вясковай гаспадаркай, пабудавалі іншы раз цэлыя вёскі і гарады, насялёныя толькі сваімі, і цяперака зьяўляюцца сталым жыхарствам Амэрыкі, досіць, а часам і вельмі, заможным.

Большасьць-жа прыехала часова „падзарабіць грошы“, каб зьвярнуцца на бацькаўшчыну і наладзіць папсаваныя справы. Гэтыя стараліся дастаць працу па гарадох, бо тамака, хоць і вымагалі больных высілкаў, але вельмі добра плацілі.

Калі наступіла вялікая вайна, некаторые, з маладзейшых былі ўзяты ў войска, рэшта-ж вельмі добра зарабляла на фабрыках, працуючы на абарону. Вельмі многія зарабілі за гэты час досіць значныя, асабліва ў пераводзе на нашу валюту, грошы.

Каб даць зразумець гэта у цыфрах, ніжэй зьмяшчаецца табліца аплаты працы рабочага ў розных месцох за тыдзень.

ПРАЦА	Доляраў ў тыдзень	Гэта будзе польскіх марак	Калі палічыць у месяцы 4 тыдні дык будзе	УВАГІ
Вучань на лясных работах —	9	7.235	28.940	—
Кваліфіцыраваны працаўнік—	25	20.375	81.500	Гэта і ёсьць нармальная пэнсія
Працаўнік на фэрме, пры усім гатовым — — — —	12½	10.187	40.750	—
Экстрэныя работы (ачыстка сьнегу з вуліц і з дарог), дзе працуюць 8 гадзін у суткі і атрымліваюць за гадзіну 85 цэнтаў — —	45	32.600	130.600	Экстрэная праца—рэдка цягнецца больш за тыдня, але папрацаваўшы тыдзень працаўнік можа адпачываць цэлы месяц.

Атрымліваючы гэткія грошы і заўсёды маючы працу, нашы беларусы за час вайны паспелі адлажыць ў банк або ў іншае надзейнае месца досіць значныя сумы.

Але гэткае становішча цягнулася толькі да часу стварэньня перамір'я на Эўропэйскім фронце.

Як толькі стала непатрэбным больш пастаўляць знарады, амуніцыю, вопраткі і іншыя вайсковыя рэчы на фронт, дык фабрыкі спынілі выраб (праізводтзва), а працаўнікі часова апынуліся бяз працы.

У гэты мамэнт Амэрыка перажывае страшэнны экономічны крызіс.

Выраб (праізводзтва) — немаль што ня ўвесь спыніўся.

Працаўнікі — разьлічаны і ня маюць працы.

Сярод 3.000.000 беспрацоўных, налічаных у апошнія часы Амэрыканскімі Працоўнымі Сувязямі, — шмат есьць і беларусаў.

У зьвязку з гэтым усіх папягнула да родных хат. А тут яшчэ, карыстаючыся крызісам, бальшавіцкія агітатары павялі прапаганду за зварот на бацькаўшчыну.

Найбольш гарачыя голавы заразжа злажыліся і паехалі дамоў. Больш асьцярожныя пакуль што засталіся і чакаюць вестак ад папярэдніх. Але трудна ім уседзіць ў Амэрыцы. Найперш — амэрыканскі урад, спужаўшыся крызісу, пастанавіў высяліць з Амэрыкі 100.000 „расейскіх“ эмігрантаў. Па-другое — бальшавікі ў 15-цёх амэрыканскіх расейскіх газэтах гудам-гудуць, каб ўсе зьвярталіся будаваць социялістычнае жыцьцё і не рабіліся-бы зраднікамі і сабатажнікамі, седзячы ў буржуазнай Амэрыцы. Па-трэцьцяе — некалькі дзесяткоў параходных кампаніяў, маючы на мэце як мага больш зарабіць і шукаючы пасажыраў, вядуць страшэнную агітацыю за зварот на бацькаўшчыну, прапануючы і шыфскарты, пашпарты, і праважатых да Лібавы, толькі сядайце, калі ласка, і хутчэй давайце вашыя доляры.

Пры такіх варунках, калі ўсе думкі скіраваны на адшуканьне працы і на зварот дамоў, цяжка весьці якую-небудзь нацыянальна-арганізацыйную або нацыянальна-культурную працу.

Палякі і украінцы пачалі яе шмат раней, пры добрых экономічных варунках, і то цяперака яна неяк тухне перад страшэннай пагрозай голаду ў Амэрыцы.

Але усе-ж такі, не глядзячы ні на што, амэрыканскія беларусы пачынаюць варушыцца. Яны ранен былі зарганізаваны на зямляцтвах. Цяпер ідуць гутаркі між іншымі зямляцтвамі аб утварэньні агульна-беларускіх арганізацыяў і сувязі.

Нашыя заграничныя прэс-бюро пастараліся даць ў Амэрыку, як мага больш усялякіх інфармацыяў. Гэтыя весткі ахвотна друкуюцца цяперака ўва усей амэрыканскай расейскай, украінскай і карпатороскай прэсе.

Аб Урадзе Беларускай Народнай Рэспублікі ведае ужо кожны беларус.

Аб беларуска-польскіх адносінах друкуюцца вялікія артыкулы і перадруковываюцца цэлыя істнуючыя па гэтаму пытаньню кнігі беларускіх дзеячоў за кардонам. Адносіны да польскай буржуазіі і панства страшэнна варожыя. На гэтым грунце, найбольш, і пачынаюць гуртавацца беларусы ў Амэрыцы. І трэба спадзявацца, што хутка мы будзем мець арганізованнае выступленьне іх па гэтаму пытаньню.

Беларускага выдавецтва пакуль што амэрыканскія нашы браты наладзіць не змаглі. Прычына гэтага тая, што ў Амэрыку выязжала да вайны выключна шэрая вясковая маса, сярод якой зусім няма беларускай інтэлігэнцыі.

І таму, калі вы чакаеце ад Амэрыкі дапамогі грашыма, дык і нашы амэрыканскія браты-беларусы чакаюць ад вас дапамогі пасылкай туды ў Амэрыку некалькіх інтэлігэнтных грамадзян, якія-б узялі на сябе кіраўніцтва культурна-прасьветным нацыянальным рухам.

К. Е.

Аб справах дня.

Сучасная Польшча, карыстаючы з часовага ўпадку Маскоўшчыны, ахвотна падзялілася з ёю Беларусьсю, уступіўшы навет большы кавалак, чым узяла сабе.

І сучасная Польшча яшчэ настолькі панская старонка, што у ёй зусім ня чуваць галасоў аб несправядлівасьці, зробленай беларусу.

Благія ўчуцьці, пасеяныя быўшым нацыянальным паніжэньнем, а цяпер узгадаваныя агульнай абстаноўкай, настолькі засьляпілі многім вочы, што цьвярозых галасоў зусім ня чуваць. І якое-ж горкае расчараваньне будзе тым людзём, калі наступіць час расплаты за сваё асьляпленьне!

А што гэты час наступіць, добра ведаюць усе, апроч асьляплёных.

Усе цьвярозыя людзі ведаюць, што граніцы, прызнаныя ў Рызе, ня будуць граніцамі Польшчы. Бальшавікі прызналі іх, каб толькі адчапіцца; дзеля іх што „пахабны“ мір з Нямеччынай, што рыжскі мір з Польшчаю — ўсё роўна. Ніколі ня згодзіцца на іх і запроўдная дэмакратычная Расея, калі-б яна зрабілася. Ня хоча прызнаваць іх і Антанта.

А насамперш ніколі іх не пацерпіць Беларусь...

Дык на якія-ж дзівы спадзяюцца асьляплёныя?

Можа на тое, што Польшча павядзе на далучанай частцы Бдларусі нямецкую палітыку? Палітыку, дзякуючы якой многія палякі-верхнесілезцы аддалі свае плебісцытныя галасы не за Польшчу, а за Нямеччыну.

Дармавая надзея... Бо ніколі не расла беларуская нацыянальная сьвядомасьць так, як расьце яна цяпер пад польскім панаваньнем.

Ніколі ня былі польскія ўплывы — палітычныя, экономічныя, культурныя — ня былі такімі слабымі па Беларусі, як цяпер, па заключэньні міру ў Рызе.

Навет тая няшчасная „Найвышэйшая Беларуская Рада“, якая дзеля бязвыхаднасьці свайго становішча ў справе адраджэньня бацькаўшчыны, сьлепа уверавала ў Польшчу і пайшла на найвялікшыя нацыянальныя афяры, прыблізіўшы свае думкі да якой-сь культурнай аўтаноміі“ па тэрміналозіі пана Скульскага; якая, ня зрокшыся сваіх прэтэнзый на дзяржаўнае прадстаўніцтва Беларусі, маўчала, калі яе бацькаўшчыну дзялілі ў Рызе, бо думала, мусіць, што і ёй там паны-апякуны нешта вытаргуюць, — навет гэтая няшчасная „Найвышэйшая Рада“ ад польскай палітыкі стала ня рада..

Калі да гэтага дадаць яшчэ літоўска-беларускі хаўрус; калі тут спомніць яшчэ выданую бальшавікамі адозву да ўсіх беларускіх дзеячаў і культурных працаўнікоў, і такую драбніцу, як асыгноўка Масквою дваццацёх (20) міліёнаў рублёў царскімі грашыма на выданьне беларускіх кніг, у той час, як Польшча дае нуль (0) міліёнаў польскіх марак навет на дэкляравачую „культурную... незалежнасьць“, ці „аўтаномію“, ці як там хто разумее; калі ўзяць ўсё гэта пад увагу, — дык будзе вельмі ясна: ці дужа моцны той грунт, на якім збудованы усходнія граніцы Польшчы мірам у Рызе?

Авой! Сярод будаўнічых новае Польшчы надта многа ёсьць такіх, што пясок уважаюць за камень, і на гэтым камені будуюць.

А беларуская і польская нацыі так цесна зьвязаны, што наш падзел — негаючая болька на польскай рэспубліцы. Калі-ж пад гэтай рэспублікай пасыплецца пясок, шмат болек будзе і ў нас.

Дык гора нам, гора і вам!

За тую „роўнасьць“, за тую „вольнасьць“.

А. Мсьціслаўскі.

Спад пылу архіваў.

I.

Першую спробу выдаваць беларускую газэту зрабіў вядомы беларускі рэвалюцыянер-паўстанец, пасьледавацель ідэолёгіі Герцэна, Костусь Каліноўскі. Як вядома, ў часе паўстаньня 1863 году ён наладзіў у Беластоку патайную друкарню — вельмі прымітыўную, ў каторай і выпускаў сваю „Mużyckuju Praŭdu“. „Газэтай“ яе лічылі затым, што агітацыйныя лістоўкі Каліноўскага з подпісам „Яська гаспадар спад Вільні“ выходзілі сыстэматычна, і іх налічаем мы шэсьць нумароў. Але да сучаснага нам тыпу газэты было ей вельмі далёка.

Выдавецтва Каліноўскага ўсё-ж такі паказвае, што ужо ў 1863 годзе вычувалася ў шырокіх сялянскіх масах патрэба пастаяннага асьведамленьня аб тагачасных падзеях пры помачы друкаванага слова. Аднак, ужо ў 1865 годзе расейскі ўрад паводле праекту ліхой памяці Гільфэрдінга выдае загад аб забароне беларускага друку наагул. Аб легальнай газэце ніякае гутаркі, значыцца, быць не магло. І затым-то мы праз увесь працяг існаваньня забароны беларускага друку — ад 1865 да 1905 году — бачым спробы ладзіць беларускія часопісі падпольнага характару. Так, ў канцы 80-ых гадоў у Менску выходзіць гэктаграфованы „Гоман“, каторага нам ужо і ўбачыць не ўдалося, а толькі памяць сучасных перакавала нам аб ім. У 1903 годзе бачым спробу выдаваць таксама падпольную „Свабоду“ (на цыклёстылю), як орган „Беларускае Рэвалюцыйнае Грамады“, — аднак, хоць гэта было за нашай памяці, і яе мы ня бачылі дзеля тае простае прычыны, што ўвесь наклад перад жандарскім обыскам быў зьнішчаны ў конспірацыйным складзе.

Далей, у тым жа 1903 годзе — на Каляды — „Беларускі Круг“ у Пецярбурзе выпускае (таксама на цыклёстылю) сшытак „Koladnaja Pisanka na 1904 hod“. Гэты сшытак, хоць і становіць вялікую рэдкасьць, перахаваўся да нашага часу. Складаецца ён з шасьцёх старонічак in 4°, пісаны ўвесь лацінкай. Пад загалоўкам, які вышэй пададзены, ён мае адрывак з народнае калядные песьні сьмяхотнага характару (мо' з часаў „жакаў“ школьных?):

„Ja żaczek, biedny robaczek,
Pa niebie biehaŭ, Susa Chrysta baćyŭ.
Kibieć, kibieć — dajcie bliniec,
Prydatku — ałatku,
Dyj.... hroszy ŭ okładku!“

Далей ідзе „Da czytacieloŭ“ — карэценькая прадмова з подпісам: „Kruh Biełaruski“ (мейсца выхаду дзеля конспірацыі не паказана). Пасьля — шэсьць вершаў: Malitwa К. К. (К. Каганца), Rodnaj Staronce Janki Łuczyny, Mużyckaja Dola Banadysia Asaki, Mużyk nia źmieniŭsia Haŭryły z Pałocka („Цёткі“), Chto ja J. Staŭbuna i Wiecier Dziadźki Pranuka (Franciška Umiastoŭskaha). У канцы — паквітаваньне па грошы, ахвяраваныя рознымі людзьмі на „К. В. О. L.“ („Koło Białoruskiej Oświaty Ludowej“ — назоў пададзены польскі, бо складкі зьбіраліся пераважна ад краёвае інтэлігенцыі з польскай культурай).

У 1904 годзе на Вялікдзень выйшла падобная-ж „Wialikodnaja Pisanka“. Гэта

Ахвяры вайны.

I.

Праца кончана у полі,
Усе сьпяшаюцца дамоў
І сьціхае ўжо паволі
Песьня жнеяў і касцоў.
Анямела ўся прырода:
Вёска, рэчка, поля й лес,
Птушкі сьпяць у сваіх гнёздах,
Сон усюды ўжо залез.
Сонца тож ужо ня сьвеціць,
Бо пайшло за горы спаць,
Выплыў срэбны круглы месяц,
Ен ўжо будзіць даглядаць,
Дзе і што тут не ў парадку,
Хто трывожыць цішыну,
Хто кідаець ў хаце матку,
Летняй ночанькай адну.
Ці-ж то можаць хто на сьвеце
Ноч каротку марнаваць,
Бо-ж як соўнейка засьвеціць,
Зноў да працы трэ' ўставаць.
Але месяц не напрасна,
Пільнаваў у гэту ноч,
Бо як соўнейка загасла,
Ен увідзеў пару воч;
Угледаўшыся ў садочку,
На дарожку, ці ня йдзець,
К ей, галубцы, галубочак,
Што мілей за цэлы сьвет.
Вось даждалася, о радасьць!
О шчасьлівае жыцьцё!
За каторае яна дасьць
Сэрца, ласкі і усё,
Што на сьвеце толькі маець,
Ен адзін ей най― мілей,
Янка-ж крэпка прыцiскае,
Гэльку мілу да грудзей.
Так праводзяць ноч каротку,
Янка з Гэлькай пад дубком,
У пацалунках у салодкіх,
Якбы пара галубкоў.
Але час ужо расстаньня,
Бо пачала ўжо сьвітаць,
Уздохі, ўсьціскі, цалаваньне,
Зноў да вечара трэ' ждаць.
Так што ночку каратаюць,
Янка з Гэлькай у садку,
І ў каханьні прысягаюць,
Не расстацца да вяку.

II.

Аб'яўлен агульны прыказ,
Клічуць усіх на вайну,
Хоць самы рабочы йшчэ час
Мусім ісьці старану
Ад ворага абараняць.
Хочаш ня хочаш — ідзі,
Калі толькі можаш трымаць
Стрэльбу ў руках. Да грудзі
Прытульваіць матка сынка,
Радасьць апошню сваю,
Жагнаець, дрыжыць хоць рука,
Згінець мо' ў першым баю.
Ірвець на сабе валасы,
Гутарку жаль заглушыў,
Адно толькі стогнець: „Пішы,
Сынку, калі будзеш жыў“.
І плачуць старыя бацькі,
Родныя сёстры, браты,
Прыяцелі, цёткі, дзядзькі,
Усе, з кім праводзіў гады.
А там што за пара людзей,
Плачуць, абняўшысь з сабой,
І туляць сябе да грудзей,
Твары заліты сьлязой.
То Янка прашчаецца так
З Гэлькай, каханкай сваёй,
І ён на вайну йдзе бядак
Згінуць ў старонцы чужой.
Калі-жа вярнуцца дасьць Бог
У родную вёску жывым,
І стануць на родны парог,
Будзе ці не, ён любім
Кахапаю Гэлькай ізноў?
Гэлька-ж клянецца на крыж,
На Боскія раны і кроў,
Вернай застацца, каліж
Ня вернецца Янка з вайны,
Замуж ня пойдзе, і так
Расталіся ў смутку яны.
Горка заплакаў бядак,
Узглянуў на Гэльку, на дом,
Кінуў старых дзе бацькоў
І сэрца замёрла у ём
З думак: ці вернецца зноў.

III.

Стогнець зямелька ад стрэлаў гармат,
Льецца нявіннай людзкой крыві шмат.
Паляцца вёскі, галеець народ,
Божая кара прышла ў гэты год.
Косіць сьмерць людцаў касьцістай рукой,
Кроў са сьлязамі ліюцца ракой.
Плачуць па дзетках старыя бацькі,
Дзеткі па бацьках, па мужах жанкі.
Вораг што раз то падходзе бліжэй,
Ноччу пажары ўсё сьвецяць відней.
Людзі кідаюць загон родны свой,
Хату жагнаюць дрыжачай рукой.
З сьціснутым сэрцам з сьлязьмі у вачах,
Едуць бяз конца, па днёх, па начах,
З роднай старонкі у край у чужы,
Там-жа ня знайдуць прыхільнай душы,
Слоў не пачуюць ласкавых нідзе,
У горы жыць будуць, у страшнай бядзе
Слёзаў пальюцца даволі гаркіх,
Многаж дамоў не вярнецца жывых.
Хто-жа ня кінуў загон родны свой,
Жыў тут таксама ў нядолі ліхой.
Хату спалілі, дабро разьнясьлі,
Пустку зрабілі з уроднай зямлі.
У ямы ў акопы парыта была,
Дзікай травою уся зарасла.
Людзі ў зямлянках жылі, як зьвяры,
Хлеба ня мелі — травою жылі.
Цяжкі, ой, цяжкі, спаткаў людзей лёс,
Многа ахвяраў дух сьмерці панёс.

IV.

Людзі ў весцы на рабоце
Сьпяць трывожным сьном,
Час у сьне стралой праходзе,
Раптам, за акном,
Крык і сьмех, іржаньне коні,
Чуецца людзям.
Усе падняліся на ногі
І бягуць к дзьвярам,
Хочуць ведаць: што такое,
Можа што гарыць,
Ці няшчасьце з кім благое,
Трэба-ж бараніць.
Толькі выбеглі ўсе з хатаў,
На двары свае,
Відзяць: ў весцы тых салдатаў
Як бы пчол ў вульле.
Крык і сьмех зьліліся ўмесьце,
Слоў не разабраць,
З коні злазяць, ў хату-ж есьці
Усе ідуць і спаць
Вось уходзяць „госьці“ у хаты,
З шумам, грамадой,
Да дзяўчатак строяць жарты,
Гутарка ракой,

ксама літэратурны зборнічак, але паскудобнасьцей аб ім даць ня можам, бо ў віленскіх архівах няма ніводнага экзэмпляру яго.

Рэвалюцыя 1905 году прынесла беларусам скасаваньне забароны друку. У восені 1906 году выходзіць у Вільні першая легальная беларуская часопісь рэвалюцыйнага характару — тыднявік „Наша Доля“ (зачыненая ўладай на 6-м нумары), а ўсьлед за ёю „Наша Ніва“. З таго часу беларуская прэса разьвіваецца болей-меней нормальна, узбагачываючыся ўсё новымі і новымі выданьнямі— штадзеннымі газэтамі, тыднявікамі, месячнікамі, квартальнікамі рознага кірунку і спэцыяльнасьці. І ўсё-ж такі мы бачым цікавую праяву: ня гледзячы на існаваньне ў вялікшых цэнтрах легальнае прэсы, якая запаўняецца працамі сыноў беларускае вёскі, на правінцыі наша моладзь прабуе сваіх літэратурных сіл на страніцах сваіх рукапісных або гэктаграфованых „часопісяў“.

У 1911 годзе у мястэчку Капылі, Менскае губэрні, залажыўся гурток соцыялістычнае моладзі, на чале каторага стаяў беларус-работнік (гарбар) Зьміцер Жылуновіч, ведомы ў беларускай літэратуры пад псэўданімам Цішкі Гартнага. Гурток знаходзіўся пад уплывам расейскае соц.-дэм. партыі, і вось гэтым тлумачыцца факт, што ён пачаў выдаваць свой рукапісны журнал (ведама, нелегальны, бо ў партыйным духу!) пад назовам „Голосъ Низа“. У журнале зьмяшчаліся артыкулы палітычнага і соцыяльнага зьместу, а такжа аповесьці і вершы. Але хутка—пад уплывам „Нашае Нівы“—паміж капыльскімі работнікамі пачынае пераважываць беларускі дух, і ў рэзультаце капыляне даюць — побач з Цішкам Гартным—цэлы сьцяг паэтаў і пісьменнікаў рознае меры (Гурла, Чарнышевіч і др.). Замест расейшчыны, яны даюць літэратурныя творы ў беларускай мове, каторыя часьцю друкуюцца ў „Нашай Ніве“, часьцю ў „Маладой Беларусі“. Але капыльская моладзь гэтым не абмежываецца, — і вось, побач з „Гол. Низа“, пачынае выхадзіць таксама рукапісная „Вольная Думка“ пабеларуску, зьмяшчаючы пераважна матарыялы літэратурныя. Яна мае характар літэратурнага дадатку да „Гол. Низа“.

У 1913 годзе беларуская моладзь у Горадні выпускае гэктаграфованую аднадзёўку: „Kołas Biełaruskaj Niwy“ (лацінкай), форматам у паў пісчага аркушу. Аднадзёўка мае ў сабе чыста літэратурны матарыял, апрача прадмовы з прызывам да нацыянальнае працы, карэспандэнцыі „З Горадзеншчыны“ і перадруку (на канцы) адозвы „Нашае Нівы“ да беларускай інтэлігенцыі у справе запісываньня народнай тэрміналёгіі. У ей знаходзім: верш „Wiasna“, аповесьць „U maroznu noč“, вершы: „Nie daŭ mnie baćka...“, „Madlitwa“, успамін „Spatkańnie wiasny“, верш „Nad Niomanam“, пераклад з польскага „Rybki“— ўсё бяз подпісаў, вершы: „Pa Kraju“ і „Pieśnia“ (подп. „Dziadźka“), „Bahataja Ty...“ (подп. „Šara ptaška“), сьмяхотны расказ „Štošci“ (подп. „Nasta“), верш бяз подпісу «Chryścinnaja pieśnia» і сьмяхотнае апавяданьне „Papała kasa na kamień“ (подп. „Michaś Bohdalewičuk). — Літэратурная вартасьць гэтых твораў зусім малая.

Асаблівую ахвоту бачым мы ў нашай моладзі да укладаньня сатырычных журналаў, якіх, аднак, мо' і не на жаль, ніхто ня браўся друкаваць. У „нашаніўскіх“ архівах, якія перайшлі цяпер да „Беларускага Навуковага Т-ва“, мы знайшлі ажно тры такія рукапісныя журналы: „Чэмер“ — 1910 г., „Пялун“ (Палын)—1912 г. і „Direwienski Czartok“. Найлепшы з іх — „Пялун“, як з боку зьместу, так і рысункаў („ілюстраваны“ ўсе тры). Судзячы паводле ініцыялаў і закранутых спраў, трэба думаць, што «Пялун» ёсьць твор беларусаў — вучняў Хіміка-Тэхнічнае Школы ў Вільні. Тут бачым карыкатуры на некаторых тагачасных дзеячоў, слабыя стораны каторых маладзёж даволі ўдачна заўважала. І толькі аб «Пялуне» можам пашкадаваць, што ён у свой час ня быў надрукаваны.

Цікава ўвага аўтара „Diraw. Czart.“ для редактара „Н. Н.“: ён кажа, што ўжо піша дзесяць гадоў, але нідзе не падаваў да друку, і што „Direwienski Czartok“ (галоўны твор „журнала“, пісаны вершам) складаецца ажно... з 48 часьцін! На жаль, верш такі, што ў друку яго хіба ўбачыць не давядзецца...

Магчыма, што, апрача тут апісаных, існавалі і іншыя рукапісныя, гэктографованыя і т. п. выданьні, аб якіх мала хто ведае. Вось, было-б вельмі цікава сабраць іх усе і згуртаваць у віленскім „Белар. Навуков. Таварыстве“. Ня гледзячы на пераважна малую літэратурную ценнасьць сказаных выданьняў, яны цікавы, як матарыял для будучых гісторыкаў нашага адраджэнскага руху.

А. Л.

Папраука.

У № 12 „Нашае Думкі“, пасьвячоным трэйцім угодкам абвешчаньня незалежнасьці Беларусі, у артыкуле грам. М. К. „Пройдзеная дарога“ ўбілася абмылка, якую сьпяшым паправіць. У артыкуле гэным сказана, што прызнаньне незалежнасьці Беларускае Народнае Рэспублікі Фінляндзіяй, Эстоніяй і Літвой ёсьць рэзультат дзеяльнасьці ураду Ластоўскага. Гэта ня зусім так: прызнаньне незалежнасьці Беларусі Фінляндзіяй і Эстоніяй адбылося пры урадзе А. Луцкевіча.

Рэдакцыя.

Неспадзейныя вынікі.

Мы ўсе добра памятаем, што пісалі польскія газэты і што гаварылі нам польскія агітатары на мітынгах („wiecach“) перад плебісцытам у Верхняй Сілезіі („Górny Śląsk“).—„Зямля гэта—казалі так—ад вякоў польская, народ там—выключна польскі. Насяленьне ў нялічаных рэзалюцыях і пэтыцыях ужо даўно выявіла сваю волю належаць да Польшчы. Толькі нямецкіе гвалты прашкаджаюць спаўненьню гэтай волі народнай!“

Так пісалі, так гаварылі. Але разам з тым клікалі ўсіх палякоў на сьвеце даваць грошы на падгатоўку да плебісцыту. І грошы плылі зусюль. Многа-многа мільёнаў марак...

Ужо гэныя гарачыя заклікацьні: „давайце грошы, бо прайграем справу!“— прымушалі крэпка задумывацца над газэтнымі заявамі аб польскай большасьці ў Верхняй Сілезіі. Мала што польскія статыстыкі давалі вельмі супакоіваючыя цыфры польскага насяленьня: раз уся надзея на пабеду апіралася аб грошы, значыць, нешта тут было ня так...

Вынікі плебісцыту паказалі, што і польскія „статыстыкі“, і мэморыялы польскага ўраду, падаваныя Лізе Народаў, і пэтыцыі насяленьня Верхняе Сілезіі гаварылі... няпраўду! Бо калі гэтаму самому насяленьню пасгавілі пытаньне: да Польшчы, ці да Нямеччыны,—дык за Польшчу аказалася толькі 471,405 галасоў, а за Нямеччыну — ажно 716,406!

Як бачым, нямецкая пабеда—поўная: немцы атрымалі на 245.000 галасоў больш за палякоў. І гэта пад той час, як антанцкія войскі окупіравалі заходнюю часьць Нямеччыны, як пагражалі заняць Бэрлін, а ў Польшчы ўсё здавалася паляпшаецца, бо і конституцыю ўрэшце Сойм ухваліў, і мір з бальшавікамі быў ужо падпісаны!

Польская прэса, ня гледзячы на страшэнны удар павазе Польскага Гаспадарства, не перастае, аднак, і далей ашукаваць сваё грамадзянства і свой народ. Свой пройгрыш яны з зусім пэўнай мінай называюць...... пабедай! Чаму так? А бо, бачыце, на адным куску Верхняе Сілезіі лік пададзеных за Польшчу галасоў быў крыху большы, чым лік нямецкіх: 422.000 проці 403.000... На адным кусу, значыцца, аказалася бліака роўна палякоў і немцаў, бо-ж тыя 19000 галасоў польскае перавагі становяць толькі 2 пр. ўсіх пададзеных на гэтым куску галасоў!

Ну, няхай сабе пахваляюцца „пабедай“, няхай крычаць „ура“, няхай гавораць урачыстыя прамовы, няхай баламуцяць свой народ далей... Жыцьцё само расчыніць вочы польскага народу і пакажа яму, куды вядзе палітыка авантур, палітыка захватаў чужых зямель.

А мы з вынікаў плебісцыту робім для сябе такі вывад: і ў нас польская казённая статыстыка паказвала „польскую большасьць“, і ў нас рабіліся ухвалы „рад гмінных“ і нялічаных „wieców“ віленскіх дэвотак аб прылучэньні да Польшчы, і ў нас, калі-б дайшло да плебісцыту, вынікі былі-б так сама неспадзяваныя для палякоў, як у Верхняй Сілезіі. Што гэта разумеюць і тыя, што кіруюць усей польскай палітыкай, паказвае спроба замяніць плебісцыт „соймам“; выбары ў „сойм“ адбываліся-бы пад націскам польскае аружнае сілы, польскай жандармэрыі і ўсяе польскае адміністрацыі і кліру.—а плебісцыт, як і ў Верхняй Сілезіі, вялі-бы бесстаронныя прадстаўнікі Лігі Народаў...

Ів. Мялешка.

P. S, Усе пададзеныя намі тут цыфры ўзяты з варшаўскай эндэцкай газэты „Gazeta Warszawska“ № 82 з 24 марца с. г. Сілеiскія польскія газэты падавалі плебісцытныя вынікі толькі ў пачатку плебісцыту, пакуль здавалася, што перавага будзе ў палякоў,—але як выясьнілася, што палякі праігралі, дык далейшых вынікаў не друкавалі. Затое ксяндзы-палякі і па гэты дзень абвяшчаюць народу нашаму з амбоны „вялікую польскую пабеду ў Верхняй Сілезіі“.

Мы бачым з цыфр, якая гэта „пабеда“!

І. М.

Думкі старога пэдагога.

(З прыгоды 3-х гадоў незалежнасьці Беларусі).

Найважнейшым варункам правільнага развіцьця усіх бакоў народнага жыцьця ёсьць культура народу. У гэтым кірунку беларусы надта адсталі ад сваіх суседзяў і па колькасьці адукаваных людзей і па граматнасьці сялян. Трэба, па магчымасьці, шыбчэй падаганяць згубленае, а дзеля таго трэба анамерна арганізаваць школьную справу. Як можна больш пачатковых школ па вёсках і вышэйшых пачатковых па валасьцёх! Пасьля, патрэбны вучыцельскія сэмінарыі для падгатоўкі народных вучыцялёў. Патрэбны сярэднія школы для падгатоўкі народнай інтэлігенцыі, для чаго належыць лепшых з канчаючых народныя школы памяшчаць у бурсы для атрыманьня сярэдняй асьветы. Найбольш здольных і найлепей скончыўшых сярэднія школы трэба адсылаць ў унівэрсытэты, палітэхнікумы і г. д. Гэтак рабілі ліцьвіны, украінцы і дайшлі ў працягу некалькіх дзесяткаў гадоў добрых усьпехаў і у цяперашні час яны маюць запраўды

У іх ліецца, але трэба
Глянуць да ўдавы,
Што жывець у хатцы небам
Крытай. Малады
Там яфрэйтар затрымаўся,
Зараз за гачкой,
Ен ухаджываць узяўся.
Дзеўцы-ж маладой
Ен наравіцца, ды Янку
Трудна ей забыць.
Доўга думала на ганку
Й сьлёзы стала ліць,
Бо ня выдзержала сэрца
Гэльчына далей,
Хоць яно да Янкі й рвецца
Гэты-ж стаў мілей,
І з яфрэйтарам ўжо ночкі
Стала каратаць,
Радасьць сьвеціцца у вочках,
Шчокі аж гараць
Ад гарачых цалаваньняў
Дзьмітры-ж не драмаў
І жаніцца бяз устаньня
Гэльку намаўляў.
Гэлька згодна йсьці адразу
Замуж за Дзьмітра
І к вясельню ўжо наказы
Усей радні дала.

V.

„Вот дзе спатканьне! Як пажываеш?
Ну, раскажы, што чуваць?
Віджу, вясёла штось выглядаеш,
Радасьць на твары відаць“.
Гэтак пытаець Дзьмітру вясёла,
Верны таварыш яго,
З ім ён праводзіў радасьць і гора
У часе дзяцінства свайго.
„Я, брат, жанюся, ведаеш гэта?
І на вясельля прашу“.
—„Што ты гаворыш, ты-ж маеш дзетак
Жонку такую красу,
І прысягаўся ей, браце, мой мілы,
Перад аўтарам ў царкве,
Верным астацца аж да магілы,
Дзе-ж цяпер словы твае“?
Дзьмітры-ж падумаў трохі дый кажаць
„Сябра, ты знаеш мяне,
Гэта вясельле рук мне ня зьвяжаць
Тут, у чужой старане.
Знаць-жа ня будзець жонка нічога,
Што я з другою жанат,
Мы-ж пагуляем з помаччу Бога,
Посьля... дарог маем шмат“.

VI.

Гэй, музыкі, рэжце ў скрыпкі,
Струн няма што шкадаваць,
Сёньня дзень для нас вялікі,
Мусім ў волю пагуляць.
І музыка бэз аддухі
Рэжаць ёмка па струнах,
Што ня ўседзіліб і мухі
Па зашчэльлю у сьцянах.
З хлопцаў клубам вернець пара,
Пот ліецца з іх цурком,
А музыка болей жару,
Паддаець для іх смыком.
Гоман, сьмех і жарты ў хаце,
На сьціхаюць ані чуць.
Там вясёла дзеўкі-свацьці
З Гэлькай гутарку вядуць.
Жычуць долі, ей і шчасьця,
У далёкай старане,
Бо спаткацца больш ці ўдасцца,
Стала шкода ім яе.
Але жалю тут ня мейсца,
Сьлёз няма што праліваць,
Кожны ў скокі толькі рвецца,
Усім ахвота пагуляць.
Каля печы толькі маці
Ня стрымаець горкіх сьлёз,
І бядуець па дзіцяці,
Ці шчасьліў ей будзець лёс.
Сэрца маткі штось трывожна,
Не вясёла на душы,
Штось за надта ўжо ей тошна,
Штосьці чуецца ў глушы.
Штось яна ня надта рада,
Замуж Гэлька што ідзе,
Так і чуецца ей зрада,
Ой ня стацца каб бядзе.
Твар у яе заліт сьлязамі,
Ды ня час ўжо бядаваць.
Госьці селі за сталамі,
Трэба есьці падаваць.
Гэлька з Дзьмітрам даражэнькім
Засе аець на куце,
Толькі бразгаюць талеркі,
Чарка ў вочарадзь ідзе.
Прагуляялі так да раньня,
Ды пара ужо дамоў,
Гэльцы шчасьця на расстаньню
Жычуць усе на сто гадоў.

VII

Над калыскай плачаць матка,
Ня стрымаець сьлёз,
Ох ты, беднае дзіцятка,
Пакараў нас лёс.
Ты застаўся сіратою,
Я на век ўдавой,
Татка-ж гэтай мо' парою
Жэніцца з другой.
Ох, як цяжка Бог няшчасну
Пакараў мяне,
За прысягу за напрасну,
Што дала ў гумне,
Я для Янкі, як ішоў ён,
Бедны па вайну,
Ды ня зьдзержыла тых слоў я,
Што дала яму.
Ен вярнуўся, хоць калекі,
Толькі-ж для яго,
Я прапала ўжо на векі...
Ждаць цяпер чаго?
Усё на сьвеце мне прапала,
Горкі, горкі лёс,
Хай бы лепей я сканала,
Зьмёрзла у мароз,
Чым цярпець такія мукі,
Праз дурнось сваю,
А цяпер ламлю ўсё рукі,
Сьлёзы горкі лью.
Так бядуець над калыскай,
Гэлька кожны дзень,
Янка так-жа ў хаце блізкай
Ходзіць быццым цень.

Вінцук Сталяронак.

Вільня
Люты 1921 г.

народную інтэлігенцыю. Праўда, беларусы знаходзяцца ў параўнаваньні з імі у куды больш цяжкіх варунках, бо Беларусь падзелена на некалькі частак паміж бальшавікамі, палякамі, Сярэдняй Літвой і ліцьвінамі. Дзеля гэтага цяжка збудаваць адзін агульны плян школьнай асьветы для ўсей Беларусі; апрача таго, ў кожнай часьці яе прыходзіцца сустракаць ў школьнай справе рознага роду перашкоды-палітычныя, адміністратыўныя і іншыя.

Але ўсёж-такі гэтыя перашкоды не павінны паслабляць энергіі беларускіх дзеячоў на шляху да стварэньня народнай інтэлігенцыі. Трэба скарыстаць усе магчымасьці ў кожнай часьці Беларусі, але трэба працаваць планамерна. Трэба таксама пасьпяшыць са стварэньнем вучэбнай і навучнай тэрмінолёгіі, са складаньнем і перакладам вучэбнікаў і розных школьных дапамог. Для гэтага трэба скарыстаць усе інтэлігэнтныя і навучныя сілы ня толькі беларусаў, але і усіх прыхільнікаў беларускага нацыянальнага руху.

На школьную будоўлю, у шырокім значэньні гэтага слова, ня варта шкадаваць грошаў: кожная марка, страчаная на гэтую мэту, акупіцца у будучыне старыцай.

На астачу трэба дамагацца ўводу пры Віленскім Унівэрсытэце катэдры беларускай мовы, беларускай літэратуры і беларускай гісторыі і замяшчэньня іх беларускімі вучонымі. Патрэбна дамагацца ў тым-жа унівэрсытэце паралельных катэдраў па іншым навукам і факультэтам з выкладаньнем на беларускай мове беларускімі вучонымі, на падобе таго, як істнуюць гэткія катэдры ў Львоўскім унівэрсытэце ў Усходняй Галіцыі, з выкладаньнем украінцам на ўкраінскай мове.

Усё гэта магчыма, ўсё гэта дэступна, толькі больш энэргіі і агульнай згоды.

А. Дмахоўскі.

21.III. 1921 г. м. Вільня.

* * *

Сьветла. спакойна, лёгка бяз конца,
Грэе і лашчыць вясеньняе сонца.
Сінія далі ў імгле галубой,
Лес прад вачмі вырастае сьцяной,
Сьнег між кустамі, між пнямі бялее,
Ветрык вссеньні, жартуючы вее
З поля, гдзе густа чарнее зямля,
З поля, гдзе сяньня пануе вясна.
Там, дзе з блякітам зьліваюцца далі,
Горы палоскаю сіняю ўсталі,
Места там недзе між гор заляглo,
У дымцы хавае сваё характво,
Звоняць у Вільні ледзь чутна, і гукі
Сэрца чапаюць знаёмаю мукай,
Ціха...а тут паміж соснаў старых
Уецца дарога да елак густых,
Уецца, зьнікае, ізноў выбягае,
Поле і сьнег у кустох агібае,
Уецца лагчынкай, гдзе цені ляжаць,
Сосны дзе ў сінке неба глядзяць...
Ціха, ўсё ціха... Заплюшчыўшы вочы
Тут бы, на сонцы, сядзела да ночы,
Твар прылажыла-б да цёплай зямліцы,
Слухала-б грукат вясеньні крыніцы,
Слухала-б тое, што ветрык пяе,
Усё, што гаворыць душы аб вясьне.
Сьветла, спакойна, лёгка бяз конца,
Грэе і лашчыць вясеньняе сонца.

Натальля Арсеньнева.

Дзеяльнасьць беларускіх эсэраў.

(Ад нашага карэспандэнта).

ВЕНА, 18 *сакавіка.* Азнаёміўшы прадстаўнікоў усіх палітычных партый, якія былі на Венскім Соцыялістычным Кангрэсе, з сучасным палітычна-грамадзкім становішчам Беларусі і змаганьнем Партыі Беларускіх Соцыялістаў Рэвалюцыянэраў за незалежнасьць і непадзельнасьць Беларусі, вядомы лідэр партыі Тамаш Грыб выехаў у Коўню. З Коўні з такімі-ж мэтамі ён мае паехаць у прыбалтыцкія і скандынаўскія гаспадарствы.

ШТОДЗЕННЫЯ ВЕСТКІ.

Чацьвер, 24 *сакавіка* 1921 *г.*

— Горад Батум забралі туркі.

— Бальшавікі аднавілі свой наступ на Грузію і забралі Поці. Абвешчана Савецкая Грузія.

— Расейскім паслом у Лёндане будзе Красін.

Пятніца, 25 сакавіка 1921 г.

— Водле пастановы арбітра, Паланга на Балтыцкім моры адходзіць к Ліцьве, а ня к Лацьвіі. Літва дастаець Палангенскую правінцыю з 20-ма кіломэтрамі узьбярэжжа.

Субота, 26 *сакавіка* 1921 *г.*

Палякі, дастаўшы большасьць галасоў толькі ў адной частцы Верхняй Сілезіі, стаяць за падзел краю, каб далучыць гэтую частку да Польшчы, а немцы бароняць непадзельнасьць В. Сілезіі, каб яна ўся дасталася Нямеччыне.

— Нямеччына ня хоча плаціць міліард марак золатам Антанце і не заплаціла, хаця час прайшоў.

— 10 парыжскіх камуністаў, абвінавачаных у змове супроць бясьпекі гаспадарства, судом абязьвінены.

— У Празе адчыняецца сусьветны кангрэс эсперантыстаў.

Ангельцы пакаралі ў Дубліне 6 ірляндзкіх незалежнікаў сьмерцьцю.

= 1-га чэрвеня 1921 г. ў Маскве зьбярэцца трэці сусьветны конгрэс III-га камуністычнага інтэрнацыянала.

— У Кранштаце нармальнае бальшавіцкае жыцьцё.

Нядзеля, 27 *сакавіка* 1921 *г.*

— Савецкая фэдэрацыя асыгнавала 50 міліёнаў рублёў золатам на купляньне заграніцаю машын.

— „Хаўрус Адраджэньня Расеі“ прызнае міравую ўмову, зробленую ў Рызе, і рыхтуецца на ёй будаваць свае адносіны да Польшчы.

Панядзелак, 28-га сакавіка 1921 *г.*

— З Масквы паведамляюць, што 10-ты зьезд камуністычнае партыі пастанавіў даць сялянам поўную волю над сваёй гаспадаркай, назаўсёды спыняючы хлебныя рэквізыцыі. Затое сяляне павінны будуць плаціць падаткі натураю. Заплаціўшы падатак, селянін мае права прадаваць хлеб і іншыя рэчы свае працы у вольным гандлі праз коопэратывы.

— У Нямеччыне выбухнулі камуністычныя паўстаньні ў розных месцах. У Лейпцыгу, Дрэздэне і Фрэйбургу у вадно і тое самае раньне паўзрываны будынкі судоў, а ў Радэвіц дынамітам разьбіта ратуша. Шмат дзе забастоўкі. Камуністы заклікаюць работнікаў зрабіць у Нямеччыне савецкую рэспубліку.

Аўторак, 29 *сакавіка* 1921 *г.*

— Арганізатары паўстаньня ў Кранштаце уцяклі ў Фінляндыю.

— „Wos. Zeit.“ паведамляе, што камуністычнае паўстаньне, гэтак неўспадзеўкі выбухнуўшае ў цэнтры Нямеччыны і ў Гамбургу, выклікана загадам з Масквы.

— Ангельскі ўрад хоча зрабіць выбары ў ірляндзкі парлямэнт, але ніяк ня хоча дапусьціць ірляндзкай рэспублікі.

— Пачалася грэка - турэцкая вайна. Грэкі наступаюць і знаходзяцца за 20 вёрст ад Брусы.

— Туркі выйшлі з Батума.

Серада, 30-га сакавіка 1921 *г.*

— **Літоуска - польскія перагаворы у Брусэлі пачнуцца 18 красавіка (апрэля).**

— Ліга Нацый адмовілася рабіць плебісцыт у Віленшчыне, баючыся, што пасылка ў Вільню інтэрнацыянальнае арміі спрычыніцца да агульнае забастоўкі ў Эўропе.

— Непаразуменьне між Нямеччынай і Антантай ня згубіла сваей войстрасьці. Антанта пагражае павялічыць кару, калі Нямеччына не заплоціць к 1-му мая 20 міліардаў марак золатам.

— Чэхі ня пойдуць супроць Нямеччыны.

— Неўзабаве мае адбыцца новая конфэрэнцыя старшынь міністраў, на якой Антанта мае абмеркаваць рэзультат плебісцыту ў Верхней Сілезіі і новыя спасабы прынукі супроць Нямеччыны.

— У Нямеччыне камуністычная рэвалюцыя ня сьціхае. Асяродак руху у Мансфэльдзе, дзе камуністы абвесьцілі прымусовы набор і высадзілі ў паветра будынак трыбуналу. Эйсьлебен перайшоў у рукі урадовых войскаў пасьля страшэннага бою з камуністамі.

— 2 красавіка адчыніцца амэрыканскі конгрэс.

— Грэцкае войска ў Малай Азіі моцна пабіта войскамі Кемаля-пашы. 10.000 грэкаў папалася ў палон. Туркі забралі 20 гармат.

— Па ўмове Турцыі з Расеяй Батум дастаецца Савецкай Грузіі.

— У Пецярбурзе забастоўка. Рабочыя дамагаюцца перавыбараў Савета.

ЭВАЛЮЦЫЯ КРАЕВАЕ КУЛЬТУРЫ.

Калі паўзіраемся на культурнае жыцьцё нашага краю ў XIX сталецьці— асабліва ў першай палове яго, калі ўнікнем у яго істоту і прыраўнуем да цяперашняга, дык убачым у ім вялізарныя перамены. Перамены гэтыя цесна зьвязаны з пераменамі соцыяльнага характару, якія зрабіліся ў нас пачынаючы ад другой паловы мінулага сталецьця, а такжа з вырасшымі на гэтым грунце новымі праявамі: нацыянальным адраджэньнем беларускага і літоўскага народаў.

Паводле зьверхных адзнак, нашае краёвае культурнае жыцьцё мела ў першай палове XIX ст. характар польскі: наша мысьль — мысьль інтэлігэнцыі краю — прыбіралася бадай выключна ў польскую опратку, якую становіць польская мова. Гэтай мовай карыстаюцца дзеля сваіх навуковых прац нашы вучоныя; у ёй пішуць першыя беларускія адраджэнцы, жадаючы зацікавіць беларускім народам і пазнаёміць з яго творчасьцю шырокія грамадзкія кругі (Баршчэўскі, Рыпінскі, Чачот); па польску піша і найвялікшы песьняр нашае Зямлі, Адам Міцкевіч, гарачы патрыот „Літвы“ — ня выключна Літвы этнографічнай, а ўсяго Беларускага краю, колішняго Вялікага Князьства Літоўскага; урэшце польскім па мове стаўся і віленскі унівэрсытэт — гэтая вялікая кузьня краёвае культуры. І гэта было зусім зразумела: бо ад часу Люблінскай уніі ў нашым краю адбываўся працэс дэнацыяналізацыі беларускай і літоўскай інтэлігэнцыі, нашы культурныя елемэнты апалячываліся, прымаючы польскую мову і ўжо ў ей разьвіваючы далей сваю культуру, а беларуская і літоўская мовы сталісь выключна мовамі народных мас: сялянства, работнікаў, дробнага мяшчанства, значыць, ня мелі магчымасьці развівацца.

Аднак, хоць прыадзетая ў польскія зьверхныя шаты, наша краёвая культура таго часу па свайму ўнутраннаму зьместу, па свайму духу была вельмі далёкай ад культуры Польшчы. І не здарма, не дзеля прыпадковага капрысу ці вузкага провінцыяльнага патрыятызма пісаў Адам Міцкевіч свой гарачы, з шчырага сэрца зварот да бацькаўшчыны: „Літва— родна Зямелька! Ты маўляў здароўе!“ Не здарма, бо вялікі паэта адчуваў усей сваей істотай духоўную сувязь сваю іменна з гэтым краем, а ня з Польшчай! каторая яму была духова чужой, не разумела яго і ае здалела эцаніць: першыя свае творы Міцкевіч друкаваў не ў цураўшайся яго Варшаве, а ў Маскве, дзе ён знайшоў братоў па духу між маскалямі! Але Міцкевіч — толькі адна з яркіх праяваў той духовай розьніцы, якая існавала ў сярэдзіне XIX сталецьця паміж нашай краёвай культурай, падфарбаванай польскай мовай, і запраўднай польскай нацыянальнай культурай там — у Польшчы. Каб пранікнуць да істоты гэтай розьніцы, пагледзімо, з якіх азнаўных элемэнтаў складалася наша культура і хто яе тварыў.

Што-б ні пісалі сучасныя прадстаўнікі польскага ваяўнічага нацыяналізму аб польскасьці тутэйшае шляхты, гісторыя ясна нам гаворыць, што ўжо пры нарадзінах Беларуска-Літоўскага гаспадарства мы мелі свае так-званыя „вышэйшыя“ станы: сваіх магнатаў, сваё баярства, ня кажучы аб князёўскіх радах. Тышкевічы, Сапегі і многа-многа другіх магнацкіх радоў былі косьць з косьці і кроў з крыві беларусы, і іншыя з іх слаўна заслужыліся перад нашай бацькаўшчынай і нашым народам,—недалёка шукаючы, як той канцлер В. Кн. Літоўскага, Леў Сапега, што зьвязаў сваё імя з знамянітым памятнікам нашага правадаўства, вядомым пад назовам „Літоўскага Статуту“. Вось, гэтыя магнацкія і баярскія рады Беларусі і Літвы пасьля злучэньня з Польшчай зуаўнаваліся з польскай шляхтай сьперша сваімі правамі і прывілеямі, а з ходам часу такжа і мовай. Але асталіся яны на сваей зямлі, лічылі гэту зямлю сваей бацькаўшчынай, захавалі ўсе свае духовыя асаблівасьці, і праз увесь час нашага супольнага жыцьця з Польшчай між шляхтай „z Litwy“ і шляхтай „z Korony“ існавала ня толькі духовая рожніца, але навет нейкая непрыязьнь, антагонізм. Праўда, пасьля Люблінскай уніі с'эзла забарона польскай шляхце купляць зямлю і эсядаць у Беларусі і Літве, і вось пачынае памалу напльіваць да нас польскі шляхоцкі элемэнт. Але яго ня так ужо многа, што лёгка можа прасачыць кожын, хто хоць крыху знаёмы з нашай гэральдыкай, — і мы маем поўнае права сказаць, што асназўная маса тутэйшае шляхты становіць элемэнт нацыянальна беларускі і літоўскі, толькі ужываючы польскае мовы.

Мы адзначываем гэта не дзеля таго, каб прысвоіць сабе шляхоцкі стан: адраджэньне беларускага, а таксама літоўскага народу ня так ужо яго патрабуе, бо апіраецца перш за ўсё на народных масах, на дэмосе, каторы гэная самая шляхта, хоць і блізкая яму па крыві, уціскала соткі гадоў. Мы толькі хочам паказаць, што той стан, каторы, дзякуючы соцыяльнай структуры нашай бацькаўшчыны ў першай палове мінулага веку, быў бадай адзіным тварцом краёвай культуры, ўнасіў у гэту культуру духовыя зачаткі ня польскія, а беларуска-літоўскія. А ў гэтым яму памагала мястовая інтэлігэнцыя—вялікамяшчанства,

— Усе весткі аб бунце ў Менску аказаліся неправдзівымі.

Чацьвер, 31-га сакавіка 1921 *г.*

— Бойкі камуністаў з соцыялістамі і консэрватарамі ў Бярліне яшчэ дагэтуль ня сьціхаюць. Есьць забітыя і раненыя

— Магчыма вайна Чэхіі супроць Нямеччыны.

— Літвінаў закупіў для Расеі ў Нямеччыне 600 локомотываў з расплатай золатам.

— У Рыме мае быць конфэрэнцыя малых дзяржаў.

Гандаль з Расеяй.

Падпісаньне замірэньня Польшчы з Савецкай Расеяй даець магчымасьць сур'ёзна гаварыць аб гандлю з усходам. Намячаецца, што пункты для замена вагонаў з таварамі паміж Польшчай і Расеяй будуць: з боку Польшчы—Стаўпцы, а з боку Расеі—Кайданаў. Калі ня будзе ужывацца для абмена жалезнля дарога Маладэчна-Полацак, дык, відочна, увесь цяжар сухапутнага тавараабмена паміж усходам і заходам будзе ў Менску і ў Баранавічах. Гэтыя пункты вінны стаць дужа важнымі і сюды зьедуцца гандляры для легальнага тавараабмена. Зразумела, што нелегальны тавараабмен будзе існаваць і ў другіх мясцох.

Гаворачы аб тавараабмене з Савецкай Расеяй, ня можна не сказаць, што дзякуючы таму, што прыватнага гандлю ў Расеі няма, і для прыватных гандляроў, калі-б у іх і былі схаваныя якія-небудзь тавары, бальшавікі не далі-б вагонаў, усходняму гандлю увесь абмен прышлося-б весьці з савецкімі ўстановамі і з коопэратывамі. Хто бываў у Расеі пры бальшавіках, дык той вінен ведаць, што пры немагчыма цяжкім бюрократызьме бальшавіцкага апарата, прыватнаму гандлю весьці з гэтымі установамі гандаль дужа будзе цяжка. Апроч урадовых бальшавіцкіх установаў, у Расеі асталіся яшчэ ў іншых мясцох не зруйнаваныя коопэратыўныя арганізацыі, з якімі весьці гандаль будзе значна лягчэй і якія усёжтакі у гандлёвых справах больш сьвядомы, чымся урадовыя савецкія установы. Калі газэты, выхадзячыя у нас пішуць праўду аб адмене вядомага дэкрэта аб коопэрацыі „ад 27 марца“, які дэкрэт дужа зьвязываў незалежнасьць коопэрацыі, дык можна спадзявацца, што путы, якімі зьвязывала савецкая ўлада гэтым дэкрэтам коопэрацыю, адваляцца, і коопэрацыя зможаць свабодна уздыхнуць. Калі гэта праўда, дык без таго дужа моцны апарат расейскай коопэрацыі, станець яшчэ мацней і будзе мець дужа важнае значаньне ў заменчым гандлю. Што путы з гандлю ў Расеі наагул зьнімаюць, аб гэтым за апошні час ува ўсіх газэтах і адусюль трубяць; мусі быць, якаясь доля праўды ёсьць, і магчыма, што путы гэтыя пачынаюць зьнімаць іменна з коопэрацыі.

Калі весьці гандаль з Расеяй, дык трэба мець на ўвазе тое, што галадаючая і халадаючая Расея, дзякуючы таму, што яна ня маець у дастатку вагонаў і перавозаў, ня зможаць здалёку к Польскай граніцы падвязьці сваё дабро, якое яшчэ у Расеі засталося, а змушана будзе прадаваць тое, што засталося ў бліжэйшых раёнах ад польскай граніцы, а гэта значыць, што Савецкая Расея будзе гандляваць дабром беларускіх губэрняў: Менскай, Магілеўскай, Смаленскай і Віцебскай. У гэтых губэрнях некалісь былі дужа моцныя коопэратыўныя арганізацыі. У Смаленшчыне былі: абласный Саюз Спажывецкіх Таварыстваў, Губэрскі Саюз Спаж. Таварыстваў і Саюз Крэдытных Таварыстваў (Крэдсаюз). У 1920 годзе бальшавікі зрабілі перавыбары Праўленьняў гэтых саюзаў і насільна ўціснулі у Праўленьня бальшавікоў, дзякуючы чаму гэтыя коопэратывы сталі мала чым розьніцца ад савецкіх установаў. У Магілеўшчыне быў Губсаюз у Гомлі, але і ён таксама быў захоплены бальшавікамі. У Менску быў Цэнтрабелсаюз, але, як ведама, ад яго цяпер ня так ужо многа засталося. Саўсім выпадкова нярушаным застаўся Віцебскі губсаюз, ў якім усё Праўленьне засталася тое самое, што і даўней было, а ўвесь коопэратыўны апарат губэрні застаўся такі самы моцны, які быў і да бальшавіцкіх дэкрэтаў. Саўсім нярушанымі засталіся асобныя спажывецкія таварыствы ва ўсей Савецкай Беларусі.

Вось з гэтай коопэрацыяй, мусі быць, і прыйдзецца весьці Польшчы свой абменны гандаль. Тут цікавае становішча будзе займаць коопэрацыя польскай Беларусі. Звычайна брацкія вузы зьвязываюць усе коопэратыўныя установы. Коопэратыўныя Саюзы нашага краю, якія змогуць згаварыцца з зарубежнай коопэрацыяй Беларусі, могуць згуляць дужа значную роль. Між іншым Віленскі Саюз Коопэратываў, які працуе бадай што на ўсім абшары польскай Беларусі, можа стаць дужа карысным для абедзьвюх старон, зацікаўленых абменным гандлем.

С. Чыжэўскі.

Правінцыяльны аддзел.

Абраз Беларусі пасьля вайны.

(Мястэчка Смаргоні Ашмянскага павету).

Смаргоні у мірны час выглядалі як які гарадок. Былі тут дзьве царквы і адзін касьцёл. Дамоў тут было палавіну мураваных і палавіну драўляных. Былі два рынкі, на каторых зьбіраліся кожную сераду і пятніцу на торг. Вуліцы былі друкаваныя, а па бакох хаднікі. Па вуліцах былі фанары, што кожны вечар асьвяшчалі усё мястэчка. Людзей жыло тут каля пяці тысяч. А цяпер па вайне вось як выглядае гэта мястэчка. Мястэчка, якое называлі горадам, цяпер выглядае як тая пушча, высячаная да званьня; асталіся толькі адны пні, зарошчыя травой. Дамы, якія тут былі, мураваныя і драўляныя, іх вайной папалілі на попел, а муры, пабітыя, паразваліваныя і пазарастаўшы цяпер травой і кустамі. Рынкі, каторыя ў торговы дзень былі гучныя ад галасоў людзей, быдла, коней, сьвіньней і т. д., цяпер яны зарошчыя па пояс травой, і сумна паглядаюць на людзей, каторыя праходзяць каля іх. Вечарам тут цёмна усюды, рэдка гдзе пакажыцца агонь з зямлянкаў, ці са склепаў. А людзей, якіх было тут жыдоў і хрысьціянаў поўнае мястэчка, цяпер толькі дзе-нядзе ўвідзіш, а найболей увідзіш зайцаў, якіх тут шмат завялося па тых разваліпах муроў, равоў і скляпох. Цэрквы і касьцёл з пазьбіванымі вежамі і пабітымі сьценамі ад нямецкіх знарадаў, выглядаюць сумна і жаласьліва на гэта мястэчка, зарошчае травой і кустамі, паглядаюць на сваю, кругом пустую парахвію, на поле, на вёскі зруйнаваныя вайной, паглядаюць на сваіх людзей галодных, абдзёртых, жывучых у зямлянках на гэтай лініі, на каторай расейцы з немцамі праз тры гады за чубы цягаліся. Людзей тут прыехала каля 50-ці сем'яў. Людцы тут найбольш церпяць голад, а такжа разам і холад.

Бліскі.

Праваслаўны і каталічка.

(Мястэчка Сьвіслач Ваўкавыскага пав.)

У нас у м. Сьвіслачы ксёндз ёсьць ня толькі панам, але навет і царом над сваімі прыхаджанамі. Так у мясаед гэты быў у нас такі выпадак. У м. Сьвіслач пажадалі ажаніцца хлапец праваслаўны з дзяўчынаю каталічкаю, абое беларусы. І вот ўсё вясельле прыехала да касьцёла браць шлюб. Але на ўсе просьбы ксёндз тутэйшы не згадзіўся і ня даў маладым шлюбу, бо малады не хацеў прыняць каталіцтва. Нічога не скарыстаўшы у ксяндза пайшлі нашы маладыя прасіць тутэйшага бацюшку, каб хоць ён пажалеў іх, бо, ведама, як-жа жыць бяз шлюбу! Бацюшка Сьвіслачскі, чалавек добры беларус, хутка згодзіўся даць шлюб. Тады ксёндз заклікаў да сябе маладую, а таксама зварочываўся да бацькоў, каб маладая ў царкве шлюбу ня брала, а сам у касьцёл ня прымаў. Пасьля гэтага ксёндз паслаў пісьмо да судзьдзі і да начальніка раёну, каб забараніць браць шлюб у царкве. У канцы гэтага маладыя ўсёж-такі зьвянчаліся ў царкве, але кожны астаўся пры сваей веры.

І. А.

Начальнік рэвіру у Беніцы палохае.

Новы начальнік рэвіру у Беніцкай воласьці вельмі ня любіць усяго беларускага і стараецца гэтую сваю ненавісьць да беларушчыны ўсюды выказываць. Не васьпеў яшчэ ён прыехаць у Беніцу, як ужо дадзеў усім беларускім школам, усяляк чэпячыся да вучыцялёў. Пан начальнік, відаць, лічыць сваім абавязкам казьдзекавацца над беларускім вучыцелем і напалохаць яго рознымі карамі. Гэткія зьдзекі былі і ў нядзелю 20-га сакавіка, калі пан начальнік загадаў зьявіцца да сябе усім беларускім вучыцялём воласьці і дазволіў сабе насьмяхацца з іх. Гэй, пане начальніку, благую вы ласку робіце польскай уладзе, стараючыся зрабіць беларускага вучыцеля непрыяцелем Польшчы. Глядзеце, пэўне вышэйшая ўлада з вамі ня згодзіцца.

Падарожны

Горадзенская беларуская кроніка.

Дзень кветкі на карысьць беларускага дзіцячага прытулку.

На карысьць дзяцей беларускага прытулку у Горадні адбыўся у нас 29 марца „дзень кветкі“, арганізаваны Горадзенскім Аддзелам Бел. Варш. Камітэта і Беларускай Школьна-Прытулковай Радай. Па месьце было пушчана толькі 20 скарбонак. Люднасьць давала ахвяры надта ахвотна. Агульнае зьлічво збору перавышае 20.000 марак.

Дзе нашы паны? Сын вялікага пана з Магілеўшчыны (двор Кадзіна і інш.) малады Галынскі працуе на карысьць бацькаўшчыны... сэкрэтаром у польскай радзе міністраў.

Пан Паздзерскі з Гор-Горак (Магіл. губ.) працуе на карысьць бацькаўшчыны... у польскай паліцыі.

Князь Друцкі-Падбярэскі (з Віцебшчыны) жывець у Польшчы, але зрабіўся сьвядомым беларусам і надта дзельна працуець ў аднэй з дэмакратычных беларускіх арганізацыяў. У прыклад іншым, князь Друцкі-Падбярэскі за кароткі час апанаваў літэратурную беларускую мову, у якой дасканальна размаўляець і пішаць.

З беларускага жыцьця.

Сьвяткаваньне Незалежнасьці Беларусі у Вільні.

Дзеля таго, што на 25 сакавіка (марца) сёлета прыпала каталіцкая вялікая пятніца, сьвяткаваньне грохлецьця з часу абвешчаньня Беларусі незалежнаю рэспублікаю было раскладзена віленскімі беларусамі на розныя дні.

Ў пятніцу 25-га сакавіка адбылося урачыстае архірэйскае набажэнства ў старой беларускай царкве Сьвята-Траецкага манастыра. Нядаўна пасьвячоны дыякан-беларус магутным голасам вазьвесьціў, а жаноцкі манастырскі хор над-

---

каторая становіць дзіўную сынтэзу заходніх наплываў і беларуска-літоўскай духовай асновы. Урэшці, да супольнай працы над тварэньнем краёвае культуры становілася поплеч і нашае духавенства, і тыя сыны вёскі, якім — хоць і вельмі рэдка — ўдавалася прабіць акружаючы іх мур соцыяльнага прыніжэньня і выбіцца, як кажуць, „у людзі“,—і яны-то йшчэ больш узмапавалі беларуска-літоўскі нацыянальны элемэнт у агульна-краёвай культуры.

Вось, мы і дайшлі да аснаўной, найбольш характэрнай рысы ў тэй культуры, якая панавала ў нашым краю бязмала праз увесь XIX век: маючы—з прычыны ўжыванай польскай мовы—зьверхны характар польскі, яна была па зьместу і духу адбіцьцем жыцьця ўсяго краю і ўсіх нацыянальнасьцяў яго—прынамся тых рознаплямённых інтэлігенцкіх кругоў, якія жылі ўжо тады культурным жыцьцём. Яна была супольнай для нас усіх: і для беларусаў, і для ліцьвіноў, і для тутэйшых палякоў, і ў значнай меры для тутэйшых-жа жыдоў. І польскія нацыяналісты зусім без патрэбы кідаюцца на беларусаў і ліцьвіноў, калі тыя лічаць Адама Міцкевіча сваім: ён для ўсіх „тутэйшых“ запраўды „наш“ і нас усіх—усе нацыянальнасьці ўміланай ім „Літвы“—ён лічыў „сваімі“ як тады, калі папраўляў Яну Чачоту яго беларускія вершы, калі разам з Марыляй піяў беларускую тужлівую песьню („Ой да цераз мой двор цяцера ляцела“), так і тады, калі жыў у Коўні сярод братоў-ліцьвіноў.

І ўсё-ж такі ў самай аснове гэнай культуры было нешта, што на парозе XX-га сталецьця вызвала глыбокую эвалюцыю ў ей. Гэтае „нешта“ крылася ў яе аднабокасьці: пры тагачасных соцыяльных адносінах народ—„дэмос“—прынімаў у тварэньні і разьвіцьці культурнага жыцьця лішне малое учасьце. Восьжа, калі пасьля ўпадку прыгону наступіла зьмена нашага соцыяльнага ладу,—дык беларуская і літоўская народная маса, збудзіўшыся нацыянальна, пачала з размахам, адпавядаючым укрытым ня зужылым творчым сілам яе, будаваць сваё асаблівае, індывідуальнае культурнае жыцьцё ад самых фундамэнтаў. З разбудзіўшыся народам пачынаюць існаваць разам і тыя спаміж „краёвых інтэлігентаў“, каторыя, ня гледзячы ва ужываньне дагэтуль польскай (а часьцю і маскоўскай) мовы, пачулі сваю еднасьць з сваімі братамі беларусамі, ці ліцьвінамі,—і яны для выражэньня сваіх думак, сваіх поглядаў, для сваіх літэратурных, публіцыстычных і навуковых прац ужываюць ужо беларускай (эвэнтуальна літоўскай) мовы. Гэта сынтэза краёвае культуры, якая існавала дзякуючы панаваньню польскае мовы, рассыпаецца на сваё інтэгральныя часткі, а кожная частка пачынае выяўляць усё вялікшы індывідуалізм, пачынае ў сваім разьвіцьці існаваць асобнай дарогай.

З гэтага мамэнту мы бачым вялікі пералом у тым, што цяпер называецца польскай культурай у нашым краю. Як раней усе, хто ўжываў польскае мовы і тварыў у ёй свае культурныя цэннасьці, жылі самабытным духовым жыцьцём, вельмі мала, або і зусім не аглядаючыся на Варшаву (Варшава-ж тады многа карыстала з працы „тутэйшае інтэлігенцыі“!),—так цяпер тутэйшыя палякі, выдзяліўшыся ў зусім замкнёную духова групу, жывуць пазычаным з Польшчы сьвятлом культуры. „Літва“ (ў старым разуменьні) нічога ня творыць для Польшчы: толькі тутэйшае польскае грамадзянства аддае Варшаве сваіх найлепшых сыноў, каторыя губляюць усю сваю „краёвую“ індувідуальнасьць, зьліваючыся з агульна-польскім нацыянальным морам...

Так на нашай зямлі нарадзілася нова-польская культура, пазычаная з Польшчы, вузка нацыянальная. І чым цясьней яна зьліваецца з культурай польскага народу там—у Польшчы, чым далей адыходзіць ад агульна-краёвага пня, з каторага вырасла, тым больш чужой становіцца для беларусаў, ліцьвіноў, жыдоў. А побач узрастаюць нацыянальныя культуры: беларуская, літоўская, жыдоўская.

Ці добра гэта для краю?

З аднаго боку яно—прынамся ў першы час—блага, бо аслабляе культурную сілу краю, як цэлага. Але гэта толькі на нейкі час. Бо разрастаньне культуры другіх нацыянальнасьцяў краю, маючы ў аснове вялізарную, многамільённую масу нязужыўшага яшчэ сваіх сіл „простага“ народу, суліць у будучыне такія пэрспэктывы, каторыя з навязкай пакрыюць адход у Польшчу значнай часьці старой краёвай інтэлігенцыі. Не ў аднароднасьці, не ў упадабленьні ўсяго жывога выяўляецца сусьветны поступ, а, наадварот, у гармонійнай разнароднасьці, размавітнасьці. І разнароднасьць праяўленьня духа рознаплямённага насяленьня нашае Бацькаўшчыны становіць пароку новага расьцьвету яго культурнай моцы, абы толькі гармонія ня была расстроена праявамі дзікага нацыяналізму і заданьнем аднэй нацыянальнай групы паняволіць усе другія і навязаць ім гвалтам свой язык і блеск імпортаваных з-за мяжы чужых нам культурных цэннасьцяў.

Ант. Навіна.

Вільня, 12. III. 1921.

та чынна і хораша сьпяяў „многая лета беларускай дзяржаве і благавернаму беларускаму ўраду“... Вялікая царква была поўная, і шмат у каго на ваччу сталі сьлёзы. Пры выхадзе народа з царквы разыйшлося колькі сот экзэмпляраў сьвяточнага нумара „Нашае Думкі“.

Увечары таго-ж дня ў актовай салі Базыльлянскіх муроў адбылося урачыстае паседжаньне Беларускага Нацыянальнага Камітэта, на якім былі прадстаўнікі усіх беларускіх арганізацый і шмат пачэсных гасьцей. Саля была поўная, і многія сталі, бо ня было дзе сесьці. Паседжаньне распачаў сваёю прамовою старэйшы беларускі дзеяч і пачэсны сябра Бел. Нац. Кам. — грамадзянін Антон Луцкевіч. Прыгожа, абразна і з вялікім хвалюючым пад'ёмам прамоўца намаляваў гістарычны шлях, пройдзены беларускім народам да абвешчаньня незалежнасьці 25/III 1918 г., высьніў вялікую вагу ў нашай гісторыі гэтага акта і заклікаў усіх да няўпыннае далейшае працы, каб зрэалізаваць у поўным ёме абвешчаны на ўвесь сьвет тры гады таму назад наш сьвяты ідэал незалежнасьці.

З гарачымі прамовамі выступалі далей прадстаўнік беларускай хрысьціянскай дэмакратыі ксёндз Адам Станкевіч, прадстаўнік эсэраў Чарацук, А. Смоліч і інш. Прытулковыя дзеці пяялі гімны, а ўся саля разам з імі сьпяяла „Ад веку мы спалі“..

На трэці дзень каталіцкіх сьвят, у аўторак 29-га сакавіка, адбылася другая частка сьвяткаваньня незалежнасьці. У Баніфратэрскім касьцёле была імша, прычым сьвятыя [illegible] былі сьпяяны пабеларуску з [illegible] лепшых віленскіх беларускіх [illegible] сіл, потым ксёндз А. Станкевіч с[illegible]ў казаньне.

Гэта было гістарычнае першае пасьле векавога перарыву казаньне пабеларуску ў Вільні.

Касьцёл быў перапоўнены і ня толькі інтэлігенцыяй, але таксама народам. Цікаўна адзначыць, што ў касьцеле быў праваслаўны сьвяшчэньнік - беларус а. Пліс, настаўнік закона ў Беларускай Гімназіі, і некалькі палякоў, зайшоўшых паслухаць беларускае казаньне.

Роўна ў 1 гадзіну гэтага дня ў салі Беларускага Драматычнага гуртка (Біскупская, 12), недалёчка ад касьцёла, сабраліся дзеці з малодшых клясаў Гімназіі і з усіх пачатковых беларускіх школ у Вільні. Дзяцём было вытлумачана значаньне Сьвята Незалежнасьці, а потым дзеці дэклямавалі, пялі, паказвалі рытмічную гімнастыку з беларускімі флачкамі ў руках. Асабліва добра дэклямавалі дзеці Кальварыйскае школы, а гімнастычныя абразы пад музыку вельмі хораша прадставілі дзеці з Радунскай школы.

Увечары ў той-жа салі быў спэктакль, перад якім пасьля беларускае прамовы выступілі з прывітаньнямі прадстаўнік польскай арганізацыі „Odrodzenie“ п. С. Міцкевіч, прадстаўнік віленскага жыдоўскага насяленьня д-р Выгодзкі і прадстаўнік ліцьвіноў ксёндз Краўяліс; усіх прадстаўнікоў тутэйшага дэмакратычнага грамадзянства сабраныя віталі доўгімі воплескамі, асабліва-ж літоўскага прадстаўніка, якога віталі на сцэне і ў салі. Сярод гасьцей многа было відных віленскіх дзеячоў усіх нацыянальнасьцяў, прадстаўнікоў прэсы і г. д.

На пачэсным месцы сядзеў праваслаўны епіскап Елеўферый. Госьці былі запрошаны на пачастунак.

На сцэне йшоў „Бутрым Няміра“ Ф. Аляхновіча з самім аўтарам у ролі Бутрыма.

Паштовая скрынка.

С. Шыманскаму. Вучыцялі жаляцца, што не дастаюць „Нашае Думкі“. Мы пасылаем, як Вы казалі, да запытаньня ў Трабы. Можа падасьцё нам адрасы ўсіх вучыцялёў паасобку?

ІНФОРМАЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ.

Бібліатэка Беларускага Навуковага Т-ва будзе адчынена дзеля карыстаньня на месцы для навуковых мэт ў памяшчэньні Т-ва пры Вострабрамскай вул. № 9.

Беларуская Кнігарня „Беларускага Выдавецкага Т-ва“ мае на прадажы ўсе беларускія кніжкі. Адрэс: Завальная 7.

Беларускі Нацыянальны Камітэт месьціцца ў Вільні, Вострабрамская, 9, пакой № 5. Старшыня Ф. Ярэміч. Робіцца рэгістрацыя беларусаў і даецца духоўная і матар'яльная помач

1-я Віленская Беларуская Гімназія месьціцца на Вострабрамскай вул., 9. Дырэктар М. Кахановіч, інспэктар А. Дмахоўскі.

Беларускія пачатковыя школы ў Вільні. 1) Кальварыйская, 73 2) Лідзкі тракт, могільнік; 3) Радунская 27-а; 4) Зарэчча, Панамарская, 12. Навука бясплатная. У кожнай школе даецца дзяцём сьнеданьне.

Беларускі Школьны Аддзел Вільня, Каўкаская вуліца (рог Вялікай Пагулянкі), 2, другі паверх, налева, пакой № 13.

Беларускі Вучыцельскі Саюз Канцэл. 1-й Віленскай Беларускай Гімн

Прытулак Камітэта Помачы, Вострабрамская, 9 (будынак гімназіі). Загадчыца Л. Васілевіч.

Віленскі Саюз Коопэратываў Малая Погулянка, дом № 12

Коопэратыў „Райніца“ ў Вільні. Вялікая Пагулянка, 17.

Беларускі Клюб ў Вільні. Біскупская, 12.

Літоўская поліклініка. (Віленская вул. проці Дабрачын. зав.) прыймае хворых ў аддзяленьнях: хірургічных хвароб, унутраных, на вочы, акушэрства і гінеколёгіі. Пользу даюць адмыслоўцы за самую невялічкую плату.

Коопэратыўная друкарня „Друк“, Вільня, Вострабрамская, 5 (Пасаж). Там-жа Беларускае Выдавецтва У. Знамяроўскага.

Юрыдычная сэкцыя пры Віленскім беларускім Нацыянальным Камітэце месьціцца на Вострабрамскай вул. № 9.

Сэкцыя адчынена ад 11 да 2 гадзіны у дзень. Прыймаецца складаньне просьб і заяў у беларускай і польскай мове і кіраваньне іншымі юрыдычнымі справамі. Бедным беларусам—рада дарма. Дзеля працы ў сэкцыі запрошаны спрактыкаваныя юрысты.

Беларускае Выдавецкае Т-ва выдае ўсялякія кніжкі ў беларускай мове. Сябраў прынімае Урад Т-ва. Уступная плата — 50 м., сяброўская гадавая складка — 100 м. Адрэс Т-ва: Віленская вул. № 33, кв. 1 (адчынена ад 4 да 5 гадз. у дзень).

Бібліатэка б. „Знаніе“ мае багаты выбар кніжак да чытаньня ў розных мовах. Адчынена: 10—1 і 3—6 гадз. Адрэс: Віленская 33.

Віленская біржа (гэльда).

30 сакавіка (марца) 1921 г.

Царскія 500 р.	1800	мар
„ 100	450	„
„ дробныя	150—260	„
Думскія 1000 р.	680	„
„ 250	530	„
Кярэнкі	180	„
Доляры	780	„
Фунты	3300	„
Франкі	57	„
Нямецкія маркі	1360	„
Осты	1340	„
Савецкія у буйных купюрах па 5 і 10 тысяч за кожную сотню	4¼	мар.

Пачатковыя школы, бібліатэкі, чытальні, могуць палучаць „Нашу Думку“ **ДАРМА,** выслаўшы толькі грошы на перасылку газэты, (24 маркі ў 3 месяцы).

Усіх паважаных грамадзян войтаў і солтысаў, якім пасылаецца „Наша Думка“, просім прысылаць нам адрасы сялян, якія таксама хочуць палучаць газэту.

Рэдактар-Выдавец М. ГАРЭЦКІ.

Кооп. Друкарня, „ДРУК“, Вострабрамская, 5.